# Млын пры дарозе
# або Жодзішкаўскія рарытэты

***Як можна назваць помнікам жывую істоту? Няхай сабе і старажытную, і каштоўную, і ўнікальную… Гэты вадзяны млын пры дарозе ў архаічных Жодзішках жывы, дзеючы. Нават зімой, замецены па пояс завірухамі, з abледзянелым вадзяным колам і ў снежнай шапцы на даху, млын жыве, выдыхаючы цёплы пар, як і яго сваяк на карціне “Плябанскія млыны” галоўнага беларускага мастака-“млынара” Віктара Нямцова. Той зімні пейзаж Віктара Віктаравіча з млынам і храмам мог бы стаць дакладным брэндам Беларусі, бо фантазія творцы ўвасобіла на палатне не проста агрэгат па вырабу мукі, а спрадвечную ідэю лучнасці духоўнага з матэрыяльным: веры і хлеба.***

Сённяшняе начынне жодзішкаўскага вадзянога млына і адначасова музея мукамольнай справы - гэта не толькі агрэгаты і сельскагаспадарчыя прылады працы. Працэс памолу зерня згенерыраваў за стагоддзі магутную энергію, якая дае сілы ўсім, чые сэрцы адкрыты дабру і ўдзячнасці продкам - тым самым мясцовым майстрам-самародкам, што стварылі рукатворны цуд матэрыяльнай культуры. А жодзішкоўскі кут яшчэ ад часоў кальвіністаў ды езуітаў славіўся рамеснікамі, майстрамі на ўсе рукі. Вынаходлівасць розуму і дбайнасць рук спрыялі дабрабыту і росквіту гэтага мястэчка на стромкім беразе Віліі. Дарэчы, упершыню Жодзішкі згадваюцца ў 1511, калі вялікі князь Жыгімонт Стары дараваў ім прывілей на таргі, корчмы, кірмашы, а ў пазнейшых крыніцах чытаем, што з 1774 года Жодзішкі ўжо горад, якому кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі дараваў Магдэбургскае права.

Імклівае эканамічнае развіццё гэтага краю адбывалася ў XVI – першай палове XVII стагоддзяў, калі пасля аграрнай рэформы ў Вялікім Княстве Літоўскім, вядомым як “Валочная памера”, фарміраваліся фальваркавыя гаспадаркі, вытворчасць якіх была арыентавана на экспарт. Асабліва вялікім попытам на заходнееўрапейскіх рынках карысталася збожжа. У тагачаснай Еўропе праз рост мануфактурнай скураной вытворчасці скарачалася плошча пасяўных палёў. Гэту нішу па вырошчванні збожжа запоўнілі землеўласнікі з ВКЛ. У сярэдзіне XVI стагоддзя ў Жодзішках будуецца першы вадзяны млын, дзеля чаго на рацэ Палавойцы быў спецыяльна выкапаны стаў для збору дастатковай колькасці вады.

Наогул, у ваколіцах гэтага надзвычай маляўнічага і зручнага для гандлю і земляробства месца існавала вялікая колькасць млыноў. Захаваўся да сёння толькі адзін. Яго пабудавалі езуіты напачатку сямнаццатага стагоддзя. Колішняя ўладальніца двара Жодзішкі Барбара Мінкевіч, пасля заўчаснай смерці мужа, падарыла частку сваіх уладанняў езуітам, бо членам ордэна быў яе сын Адам. Манахі гэтага каталіцкага ордэна пакінулі аб сабе памяць асветніцкай дзейнасцю, маўклівы сведка чаго – езуіцкі калегіюм, які захаваўся да нашага часу, і сёння ў яго будынку месціцца філіял абласной медустановы. Граф Канстанцін Тышкевіч, вядомы ў навуковым свеце сваёй выдатнай кнігай-даследаваннем “Вілія і яе берагі”, праплываючы ў 1857 годзе паўз гэтыя мясціны, захапляўся чароўнай прыгажосцю берагоў. Як адзначыў аўтар манаграфіі, на ўсім шляху экспедыцыі больш нідзе не бачылі яе ўдзельнікі такога хараства і прыгажосці, такой багатай флоры, а яшчэ не чулі такіх меладычных і душэўных спеваў у разнастайных жанрах народнай вуснай творчасці. Граф Тышкевіч падрабязна апісаў будынкі кальвінскага

збору і кляштара езуітаў, адзначыўшы архітэктурную сціпласць першага і багатую аздобленасць далікатнымі аркамі і маляўнічымі ўпрыгожваннямі другога. Але нідзе не згадваецца ў кнізе пра вадзяны млын. Магчыма, таму, што ён не быў нейкай асаблівасцю. На той час падобныя збудаванні існавалі ва ўсіх буйных навакольных вёсках Павілля.



На працягу стагоддзяў млын служыў людзям. Мяняліся гаспадары, а жорны працягвалі малоць зерне. У заняпад гэты гістарычны аб’ект прыйшоў, калі наогул не стала гаспадара. Некалькі дзесяцігоддзяў не працавала турбіна, пакрываліся пылам і смеццем магутныя жорны, пазарастала хмызняком і пустазеллем наваколле.

Аглядаючы экспазіцыі цяперашняга музея, страшна сабе нават уявіць, што такой каштоўнасці магло б і не быць на Смаргоншчыне, калі б не настойлівасць і нават апантанасць энтузіястаў, мясцовых краязнаўцаў і прыхільнікаў мінуўшчыны. А пачалося ўсё ў 90-х мінулага стагоддзя, калі ўраджэнец гэтых мясцін, пачынаючы прадпрымальнік Францішак Жылка ў гутарцы з дзядзькамі адчуў іх душэўны боль за разбураемы занядбаны млын. Прыгадалася маленства, калі нейкі час жыў побач з млынам, засынаў пад шум вадаспаду і прачынаўся пад гукі турбіны, што заводзіла магутныя жорны для памолу збожжа. Хлапечую цікаўнасць і дапытлівы дзіцячы розум прыцягвалі механізмы, карцела дазнацца аб працэсе іх узаемадзеяння. Ці не тут зарадзілася любоў да механікі, да тэхнікі, што ў будучым вырашыла выбар прафесіі юнака. Інжынер-механік па адукацыі і краязнаўца-падарожнік па прызванні Францішак Жылка пачаў ратаваць млын. За ўласныя сродкі

накрыў новы дах, набыў новую турбіну, устанавіў змайстраванае мясцовымі ўмельцамі вадзяное кола дыяметрам у чатыры метры. Ізноў запрацавалі жорны, мелячы зерне. Ізноў пацягнуліся да млына павозкі і машыны са збожжам. Толькі новае эканамічнае становішча значна паменшыла колькасць кліентаў, хаця і сёння прыватнікі і фермеры час ад часу карыстаюцца паслугамі гэтага старажытнага млына. А гаспадар Францішак Жылка ператварыў яго пакрысе ў сапраўдны помнік мясцовай гісторыі, разгарнуўшы на трох паверхах будынка выставы этнаграфічных знаходак, цікавых рарытэтаў з вясковых хат і колішніх фальваркаў.





Усё часцей наведваюцца аматары даўніны і звычайныя падарожнікі на гэты турыстычны аб'ект, дзе гісторык, краязнаўца, вандроўнік і бард Алег Мізула красамоўна і гістарычна-дакладна распавядае пра ўнікальнасць Жодзішак, як аднаго з цікавых пунктаў на землях колішняга старажытнага Нальшчанскага княства, пра стаўшыя экспанатамі прылады працы, зробленыя звычайнымі сялянамі, іншы раз зусім неадукаванымі, але такімі таленавітымі і руплівымі, вынаходлівымі і спрактыкаванымі ў стваральнай працы. Прыцягваюць сюды наведвальнікаў і добраўпарадкаваная пляцоўка з назіральнай вежай, з якой так прыемна аглядаць старажытны парк ля былога езуіцкага кляштара і чароўныя берагі рэчкі Палавойкі, што віхляючы бяжыць да Віліі.

Дабрачынная дзейнасць Францішка Жылкі на яго малой радзіме не абмежавалася адным толькі млынам. У сваім радавым гняздзе, засценку Стаўбуцева, ён пабудаваў мураваную капліцу Святога Францішка. Да 450-гадовага юбілею Жодзішкаўскай парафіі каля касцёла Святой Тройцы ўстанавіў мармуровую скульптуру Маці Божай. Разам з Алегам Мізулам аднавілі амаль разбураную капліцу пачатку XX стагоддзя на вясковых могілках. На рахунку прадпрымальніка-энтузіяста некалькі выдадзеных кніг па гісторыі краю, у тым ліку і перакладзеныя мемуары пра жыццё местачкоўцаў у першай палове XX ст., напісаныя стрыечным дзядулем Феліксам Жылкай, які пэўны час узначальваў Жодзішкаўскую гміну. У пасёлку Пярэсіка пад Мінскам Францішак Баляслававіч знайшоў месца, дзе некалі стаяў дом вядомага на ўвесь свет беларускага фотамайстра Яна Булгака. Ушанаваць гэту мясціну і памяць выдатнага чалавека цяпер імкнецца краязнаўца-мецэнат.

**Ала КЛЕМЯНОК.**

**Фота аўтара.**

**На здымку Францішак ЖЫЛКА – гаспадар музея-млына.**